**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Намеснік старшыні аргкамітэта
III этапу (абласнога)
рэспубліканскай алімпіяды,
намеснік начальніка ўпраўлення
адукацыі Магілёўскага аблвыканкама
____________С.В.Лявонава
“ 3 ” лістапада 2011 года

**Комплексная работа**
**для правядзення раённай (гарадской) алімпіяды**
**па беларускай мове і літаратуры**
**11 клас**

| |
|---|
| **1.** Назавіце зычны гук, які найчасцей сустракаецца ў назвах 6 абласных цэнтраў Беларусі. *(Макс. бал – 2)* |
| **2.** З прапанаваных слоў выпішыце тыя, у якіх корань уяўляе сабой камбінацыю гукаў зычны+галосны+зычны: *аб’інець, адкінуць, боскасць, вадкасць, вадзяны, ваенны, выгадна, вяночак, гаёчак, насенне. (Макс.бал – 5)* |
| **3.** У 1922 годзе гуманітарнай секцыяй Інстытута беларускай культуры быў падрыхтаваны “Расейска-беларускі слоўнік”, які меў на мэце “дапамагчы нашаму пісьменству пазбавіцца ад лішняй чужаземшчыны”. Устанавіце адпаведнасць паміж словамі рускай мовы і варыянтамі іх перакладу на беларускую мову, якія прапаноўваліся ў слоўніку.<br>**Рускія словы:** *биограф, журналист, каламбурист, корректор, корреспондент, пасквилянт, полемист, скептик.*<br>**Беларускія словы (паводле “Расейска-беларускага слоўніка”):** *брахняпісец, выпраўшчык, дапішчык, жартаслоўца, жыццяпісец, спрэчкапісец, сумнявальнік, часапісец.*<br>Прыдумайце свае адпаведнікі для замены запазычаных слоў *оптимист* і *пессимист. (Макс.бал – 10)* |
| 4. Утварыце памяншальныя (памяншальна-ласкальныя) формы наступных слоў: *гусь, камень, капыт, кросны, кураня, лета, песня, пісьмо, сэрца, шынель. (Макс.бал – 5)*<br>**Узор**: дзень → дзянёк. |
| 5. Знак прыпынку “працяжнік” мае каля 20 значэнняў. Прывядзіце прыклады сказаў з 1) *эліптычным,* 2) *абагульняльным* і 3) *дыялагічным* працяжнікамі. *(Макс.бал – 6)* |
| 6. У кожным сказе парушана адна з нормаў літаратурнай мовы. Выпраўце і запішыце правільна: *(Макс.бал – 5)*<br>*1. Ён на галаву мацнейшы за іншых прэтэндэнтаў.*<br>*2. Маці гатавала ежу ў новым гаршчку.*<br>*3. З усіх цытрусавых яна любіла толькі грэйфрукты.*<br>*4. Прэм’ер-міністр пакінуў добразычлівую зāпіс у кнізе ганаровых гасцей.*<br>*5. Дазвольце мне выразіць словы самай шчырай удзячнасці за Вашу дапамогу!* |

| |
|---|
| 7. Спішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Вызначце, якой часцінай мовы з'яўляецца выдзеленае слова.<br>*1. Каханне думаў вусны мне замкне шлях перайшоўшы з вёдрамі пустымі.*<br>*2. Я думаў больш не прыйдзе да мяне каханне з цудадзейнасцямі тымі што юнакоў пытальнікамі гне а пасівелых робіць маладымі.*<br>*3. Няма напэўна* ***горай*** *пакарання калі не свеціць над табой каханне.*<br>З прапанаваных сказаў складзіце "Актаву кахання" Анатоля Грачанікава, запішыце яе ў форме верша, не забываючыся аб тым, што кожны радок верша пачынаецца з вялікай літары. *(Макс.бал – 6)* |
| 8. Прачытайце ўрыўкі з лістоў і дарчых надпісаў вядомых беларускіх пісьменнікаў. Назавіце аўтара кожнага ўрыўка. *(Макс.бал – 5)*<br>*1. Разам з лістом пасылаю Вам у прэзент кніжку бацькі. Вы, здаецца, любіце рожныя "унікумы"; ну, дык гэта унікум і ёсць, бо надрукавана яна была ў невялічкім ліку экземпляраў і ў прадажу пушчана не была. <...>. На рэдакцыю "Н. н." пасылаю паэмку "У вёсцы", першую з аддзела "Мадонны".*<br>*2. Вы пытаецеся, чаму ў мяне ўзнікла жаданне напісаць раман. Галоўнай прычынай была памяць пра людзей, сярод якіх я нарадзіўся, доўга жыў у маладыя гады; пра родныя мясціны, якія з гадамі сталі яшчэ даражэйшыя мне. Мне хацелася расказаць пра тое, як жылі, як гаравалі, як спадзяваліся родныя мне "людзі на балоце" на лепшую долю і як яны ішлі к гэтай долі па нялёгкіх дарогах жыцця.*<br>*3. Гэта тое, што я напісаў і што ўлезла ў гэтыя вокладкі, але не ўсё, што я думаю, нашу ў сабе пра вайну, чалавека, Радзіму нашу, вялікую і меншую, нашу родную і бедную Ушаччыну.*<br>*4. Нядзеля. Сёння роўна 17 гадоў з таго дня, калі ў нас быў настаўніцкі з'езд у Мікалаеўшчыне. Учора вечарам чытаў "Дарэктар", "Начаткі", "Вечарамі", "Воўк", "Зіма ў Парэччы", "На рэчцы", "Каляды". Чытанне "Начатак" перарывалася часта дружным смехам.*<br>*5. Калі ласка, прышлі, Лёля, яшчэ матэрыялы да 1913 і 1914 гг. Іх, праўда, вельмі мала, але прышлі. Яны ўкладзены, здаецца, за 1913 г. да выпраўленага друку "У чым яго крыўда?", а за 1914 г. да выпраўленых і друкаваных на машынцы запісак "На імперыялістычнай вайне".* |
| 9. Журналісты ў артыкулах часта перайначваюць вядомыя радкі літаратурных твораў:<br>*1. Каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба паглядзець на яе вачамі іншаземца* ("Звязда").<br>*2. Трэба ў лазню хадзіць часцей* ("Народная газета").<br>*3. Кажуць, вёска мая вымірае...* ("Чырвоная зорка").<br>Устанавіце, як выглядалі паэтычныя радкі ў арыгінале. Назавіце іх аўтараў. *(Макс. бал – 6)* |